Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12, m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 2 зл. Для заграніцы ўдвая даражэй.
Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош, і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

№ 30. Вільня, Пятніца, 1-га траўня 1925 г. Год I.

Сьвята Працоўных.

Сягоньня першае мая — Сьвята Працоўных. На ўсенькім сьвеце сьвяткуецца гэты дзень, як сымвал еднасьці работнікаў усіх краёў і народаў, сымвал еднасьці вялікае сацыяльнае крыўды, што пануе на сьвеце.

Здаўна гэтак ужо вядзецца. За часоў царскае Расеі доўгі рад гадоў адзначыў дзень першага мая — крывёй працоўных. Мірныя дэманстрацыі ў вялікшых цэнтрах няміласэрна расстрэліваліся і разнасіліся капытамі казацкіх каней. Памятае Вільня, памятае Беласток, памятае перадусім Варшава гэтыя крывавыя расправы з работнікамі, якія ў той дзень ішлі пад чырвонымі сьцягамі і „нясьлі сваю крыўду на сьвет цэлы“...

Дзень першага мая заўсёды быў у нас днём мабілізацыі ўсіх пралетарскіх сілаў — бяз розьніцы нацыянальнасьцяў. У работніцкіх паходах ішлі поруч беларус і расеец, паляк, украінец, — і жыд, літвін, латыш — і сын далёкага Каўказу.

Але адначасна гэта быў дзень также і мабілізацыі чорных сілаў. Ня кажучы аб хмарах царскае паліцыі, жандароў і шпікоў, ня кажучы аб сканцэнтраваных вайсковых сілах, проці дэманстрантаў выпускаліся ўваружаныя „чорныя сотні“ — дружыны, набіраныя з самых падонкаў грамадзянства. Гэтак буржуазія, баючыся выяўленьня голасу ўціскаых працоўных масаў, старалася заглушыць гэты голас крыкамі хуліганаў і бандытаў, якія павінны былі прадстаўляць „таксама народ“.

Шмат, з тых часоў зьмянілася. Царская Расея развалілася; на акраінах яе ўтварыўся рад новых дзяржаў — дэмакратычных рэспублік. Але ад зьмены *формы* ўлады не зьмянілася *істота яе*: як і калісь, пануе ўсюды буржуазія; як і калісь, вядзе яна барацьбу з працоўнымі масамі, выпускаючы супраць сьвядомых сацыяльна рабачаяў банды абаламучаных, ці проста нанятых новых чарнасоценцаў. І, як калісь, на мірныя работніцкія паходы робяцца напады, адбываецца біцьцё і страляніна, вуліцы заліваюцца работніцкай крывёй...

Сьвята Працы, як кожнае сьвята, павінна быць днём радасьці, днём веры і надзеі на сьветлую будучыну, — дык мо' й ня гожа супыняцца на гэтых панурых абразох. Але працоўныя масы не павінны ні на адзін мамэнт забывацца аб гэтай панурай сучаснасьці, каб не згнусьнець, каб не аслабіць сваей барацьбяцкай энэргіі думкамі адно аб ясным заўтрашнім дню.

Per aspera ad astra! Праз цяжкія спробы, праз цяжкую барацьбу вядзе працоўных шлях да лепшае долі. І сьвядомасьць гэтага павінна нашаму работніку і селяніну дадаць больш энэргіі, больш сілы ў змаганьні за іх ідэал.

Хай-жа Першы Май будзе моцным поклічам для ўсіх працоўных, хай напомніць ім, што толькі самі яны — сваімі мазалістымі рукамі збудуюць сваё шчасьце і долю. Хай гэтае сьвята аб'яднае ў супольным парыве да волі работнікаў усіх краёў і ўсіх народаў, каб у сьвядомасьці, еднасьці і салідарнасьці сотняў міліёнаў працоўных пачарпнулі цьвёрдую веру ў аканчальную перамогу Працы над капіталам!

Прамова дэпут. Тарашкевіча

на пасяджэньні Сойму 26 красавіка ў часе дыскусіі аб бюджэце на 1925 г.

„Я вельмі шчасьлівы“ — ды ня я шчасьлівы, але толькі пан прэм'ер, які кожны абзац сваіх палітычных і фінансавых прамоваў пачынае гэтымі славамі: „я вельмі шчасьлівы“ і выяўляе гэтым свой непапраўны оптымізм. Калі нешта блага, дык заўсёды кажа, што магло-б быць горш, — а раз магло-б быць горш, значыць — усё добра! Але другі польскі палітык сваім мужыцкім розумам сказаў некалі дэлегацыі — здаецца, ад урадоўцаў: **ёсьць блага і будзе горай!** Гэтым палітыкам быў п. Вітас, і мне здаецца, што ці праз шчырасьць, ці затым, што сам прычыніўся да гэтага благога, ды сказаў праўду. Ужо два ці тры гады мы бачым, што ўсьцяж блага і робіцца ня лепш, а толькі горш.

Калі глянем на прамысловасьць, дык прамысловасьць спыняецца, лічба безработных усё ўзрастае, да лепшага ня йдзе! Торговы балянс, аплатны балянс гаспадарства ўсьцяж пагаршаецца. Польская буржуазія і польскае абшарніцтва распрадаюць Польшчу: прадаюць лясы, прадаюць капальні, прадаюць манаполі, — прадаюць усё, што можна прадаць. Капіталы ўцякаюць заграніцу.

Калі паўзіраемся на вёску, дык такое галіты, якая пануе цяпер, мы даўно ня бачылі. Ні хто іншы, а былы міністар фінансаў, п. Міхальскі, якога нельга западозрыць у нейкай лявіцовасьці ці ў ліцшай апазіцыйнасьці да сучаснага ўраду, — у сваім дакладзе, гаворачы аб вёсцы, кажа даслоўна, што „ў шмат якіх паветах краю ўжо драўляная саха гарэць сяньня зямлю. Што за ўпадак зямельнае культуры, паварот да сярэднявечча!“. А ў іншым мейсцы гавора: „Палажэньне вёскі шпарка імкнецца да аканчальнага ўбожства, і вельмі хутка вёска можа стацца асяродкам камуністычнага руху“. Тое, што ўрадавая статыстыка падае лічбу безработных на сто восемдзесят з нечым тысяч, — вельмі далёка ад праўды, бо лічбу безработных можна аблічаць **міліёнамі**. Асабліва востра адчуваецца гэтая нястача работы, гэты эканамічны застой, амяртвеньне ўсяго жыцьця — на Беларускіх абшарах. Бо-ж з прычыны іх геаграфічнага палажэньня — дзякуючы вайне і імпэрыялістычнай палітыцы Польшчы, якая забрала тое, што ёй не належала, і стварыла абсурдны паўночны „Калідор“, — Беларускія землі аказаліся адрэзанымі ад сьвету. Чыгункавыя лініі, што злучалі вялікія цэнтры Расеі з Эўропай, перарэзаны, і дзеля гэтага чыгункавы рух, праца на чыгунцы і цэлы рад галін эканамічнага жыцьця, зьвязаных з чыгункамі, прыпыніліся. Нашы лясы сяньня распрадаюцца за нішто, дый гэта ня йдзе. Іх прадалі, а яны стаяць. Ніякае дрэўнае прамысловасьці няма. Апрача канкурэнцыі бальшавікоў, трэба лічыцца і з тым, што экспорт ідзе цераз Гданск, дык усё зьядае чыгунка. Пры такім палажэньні беззямельная сялянская люднасьць астаецца без работы і мусіць проста з голаду мерці.

Далей, — наш край разьвіў сваю гаспадарку ў кірунку гадоўлі жывёлы. Цяпер цэны інвэнтара апалі страшэнна нізка, а цэны тавараў, наадварот, удвая ці ўтрая ўзрасьлі. Апрача таго, на плечах беларускага селяніна — скажу, больш, чым на кім другім (бо і на ўсенькім абшары Польшчы дзеецца больш менш тое самае), — на ім ляжыць вялізарны цяжар падаткаў — дзяржаўных і самаўрадовых.

Вось абраз вёскі!

Можна сказаць, што **голад**, якога наш край, як і ўся Польшча, ня ведалі, сваімі блеклымі вачыма зазірае ў сялянскую хату. І лёгка можа п. прэм'ер і ўрад сказаць: магло-б быць горш! Лёгка казаць ім: „мы шчасьлівы“, калі яны — сытыя, калі польскае чынавенства прадстаўляе цяпер запраўды новую, добра забясьпечаную арыстакратыю. Для польскіх урадоўцаў будуюцца дамы, а селянін на зьнішчаных абшарах дагэтуль яшчэ мусіць жыць у зямлянках.

Ведама, можна сказаць, што і на ўсенькім сьвеце — блага, што ўвесь сьвет перажывае пэрыяд глыбокага эканамічнага крызісу. З гэтага мы павінны чарпаць для сябе пацеху. Але, калі па ўсім сьвеце буржуазія, капіталізм змагаецца з вялізарным эканамічным крызісам, то трэба аддаць справядлівасьць польскай буржуазіі, што яна найняздарнейшая з найбольш няздарных. Прыгледзьмася, як гэтая буржуазія пры выдатнай дапамозе ўсенькага буржуазнага сьвету з'арганізавала дзяржаву, прыпомнім увесь пэрыяд спэкуляцыі, такой распанеўшай і разгуляўшайся, як нідзе на сьвеце. Хвалілі тады польскі ўрад, і пахвалялася польская буржуазія, што адбудоўвае польскае жыцьцё, — дзяржаву, прамысловасьць, — што пасьля вайны фабрыкі растуць, як грыбы пасьля дажджу. І што-ж выйшла? Запраўды, здавалася, што фабрыкі растуць. Але быў гэта рост спэкулятыўны, рост, які паказаў усю няздольнасьць польскае буржуазіі да арганізацыі прадукцыі. Бо-ж, калі пасьля пэрыяду інфляцыі настаў пэрыяд усталеньня грошы, дык аказалася, што гэныя фабрыкі ня былі аблічаны на тое, каб у працягу даўжэйшага часу вытвараць, каб датарнавацца да вымаганьняў дзяржаўнага жыцьця, а былі яны датарнаваны да таго, каб у вельмі хуткім часе — за год два — напоўніць грашыма кішані фабрыкантаў і спэкулянтаў. Гаспадарчыя адносіны ў Польскай Рэчыпаспалітай з шмат якіх паглядаў зьяўляюцца адзінымі на ўвесь сьвет — і то з паглядаў асноўных. Такога разыходжаньня цэнаў, такіх ножніцаў, такое розьніцы паміж коштамі вытворчасьці фабрычных вырабаў і збожжа бадай-што ня бачым нідзе больш на сьвеце, нават у радавых рэспубліках. Радавыя рэспублікі шмат лепш даюць сабе раду, хаця прымушаны былі перамагчы шмат больш эканамічных перашкод.

Гэты глыбокі крызіс, які перажывае сяньня Польшча, мае свае прычыны ня толькі ў эканамічных варунках, але і ў палітычных. З палітычнага пагляду польская буржуазія аказалася яшчэ менш дальназоркай. Перад усім забрала тое, што ёй не належала, — забрала вялізарныя беларускія і ўкраінскія абшары і ператравіць іх цяпер ня можа. Да гэтага пераканаьня дайшоў ужо ўвесь сьвет, той буржуазны сьвет, які пхнуў Польшчу на Усход, які дапамагаў ёй захопліваць тыя абшары. І сяньня той, хто сочыць за зьменай публічнае апініі ў дзяржавах Захаду, асабліва ў Англіі, — той скажа, што ўся Англія адным голасам крычыць, што перагляд усходніх граніц Польшчы мусіць адбыцца (воплескі на лавах меншасьцяў, пратэсты на правіцы).

Пасол **Пужан** (П.П.С.): А чаму Англія маўчыць аб сваіх калёніях?

Пасол **Тарашкевіч**: Я вельмі пану ўдзячны, Калега, бо вы мне вельмі добра дапамаглі! Я не абаронца Англіі і скажу, што, ясна, Англія крывадушна, калі гавора аб несправядлівым стане валаданьня Польшчы, а ня кажа аб сваіх калёніях. Але і вы, панове з П. П. С., — такія-ж самыя, калі гвалтоўна выступаеце ў абароне Эстоніі і Грузіі, а калі Францыя (воплескі на лавах „меншасьцяў“) або Гішпанія ў Марокко топча правы народаў, дык тады вы маўчыцё, — маўчыцё тады, калі карысьць польскае буржуазіі перашкаджае вам гаварыць аб гэтым.

Эканамічная структура Рэчыпаспалітай гэткая, што, хоч-ня-хоч, Польшча прымушана шукаць рынкаў на Ўсходзе. Гэта — бясспрэчная гаспадарчая праўда, праўда, якую так упорліва адзначала перад вайной асабліва правіца, — якраз прадстаўнікі польскае буржуазіі, якая крыху знаецца на эканоміцы. І вось, калі патрэбны гэтыя рынкі на Ўсходзе, калі трактат з Радамі стаецца неабходным, — у такі мамэнт тут робіцца ў унутраным жыцьці ўсё, каб да гэткага трактату не дапусьціць, — тут душыцца і гвалтуецца ўвесь работніцкі рух, увесь народ працоўны, а перадусім беларускія і ўкраінскія народныя масы. Не забывайцеся аб тым, што, калі б гандлёвы трактат быў навет найлепш уложаны, калі б вы мелі ад-

тых народаў, якія тамака жывуць і з якімі польскаму рынку і польскай вытворчасьці прыходзіцца мець дзела,—нязвычайна важная рэч; ды што тая варожасьць, якую вы выклікаеце і разьвіваеце на кожным кроку, можа зьвясьці да нуля ўсялякія—навет найлепшыя гандлёвыя трактаты. Не забывайцеся, што па той бок граніцы жывець **40 міліёнаў беларусаў і украінцаў!**

Паўзіраймася-ж на гэтую ўнутраную палітыку.

Ня буду чапаць гаспадарчых цяжараў, якія ляжаць пераважна і блізу выключна на плячох селяніна і работніка. У сваім часе пры разглядзе бюджэту міністэрства фінансаў—пагаворым аб гэтым. Зачаплю галіну палітычную. Вось жывы прыклад. Нядаўна—колькі тыдняў назад—адбыліся масавыя вобыскі і арышты на ўсеных „Усходніх Крэсах“ (пас. **Васыньчук:** Ганебная расправа!). У адным Навагрудзкім ваяводзтве... (пас. **Паўло Васыньчук:** У ланцугох вадзілі! Ці-ж вы людзі? Вы ня людзі!).

Віцэ-маршалак **Морачэвскі:** Прашу супакоіцца, вы ня маеце голасу!

Пас. **Тарашкевіч:** У адным Навагрудзкім ваяводзтве было 1368 арыштаў і вобыскаў (**голас:** Вось гэта польская культура і справядлівасьць!). Рабілі гэта нібы-то на падставе таго, што трэба спаралiжаваць дывэрсыйную і камуністычную работу. Сярод гэных арыштаваных, сярод тых, у каго рабілі вобыскі і над кім зьдзекаваліся, былі праваслаўныя сьвяшчэньнікі, каталіцкі ксёндз, ды рабіны. Калі ўжо духавенства робіцца сяньня камуністычным, калі ўвесь народ стаецца камуністычным, калі прыходзіцца рабіць масавыя арышты,—дык гэта паказуе, што **для вас тамака мейсца няма: бярэце свае цацкі і выбірайцеся!** Бо на гэтыя арышты толькі так можна адказаць.

Але я ведаю, дзеля чаго гэта робіцца! У тым часе заканчывалася акцыя падачы дэклярацыяў аб школах, — дэклярацыяў на падставе пастаноў, зробленых гэтым Соймам, пастаноў, за якія вы, панове, падавалі свае галасы. Дык вось, каб паказаць заграніцай толеранцыйнасьць Польшчы, паказаць, што Польшча дае свабоду і вольнасьці, забясьпечаныя трактатамі і канстытуцыяй,—выдаюцца законы. Але гэтыя законы—нішто іншае, як толькі заслона з дыму (**голас** на лавах меншасьцяў: Правакацыя!). За гэтай заслонай па жываедзку загубляецца цэлы народ. (**Голас** на правіцы: Не падбурайце, ніхто не загубляе!). А як загубляюць (mordują) людзей, аб гэтым раскажу.

У часе гэных вобыскаў у Красным заарыштавалі цэлую масу людзей (**голас** на правіцы: Бандытаў! **Голас** на лавах меншасьцяў: Вы самі бандыты!—Шум. Віцэ-маршалак Морачэвскі звоніць). **Нячуванымі спосабамі катавалі іх,**—я сам бачыў гэтых людзей!—**вырывалі ім кляшчамі пазногці, заганялі шпількі, рвалі валасы, ламалі робры, жанчынам грудзі разьбівалі,** рабілі такія рэчы, што... (Вялікі гвалт. Розныя галасы на лявіцы). Паслухайце, Калегі! А калі **забілі Вайтовіча** (— пан міністар справядлівасьці павінен аб гэтым ведаць!), дык цела яго выкінулі з гэнае катоўні на вуліцу, і гэты чалавек **тры дні ляжаў на вуліцы,** а гранічная варта таргавалася з паліцыяй аб тое, хто мае яго забраць стуль. Вось як! А якія гэта былі „бандыты“, якія гэта „камуністы“, найлепш паказуе тое, што **гэтыя людзі—скатаваныя, зьбітыя, пакалечаныя—былі звольнены сьледчым судзьдзёй!** І вы, пане, адважаецеся рабіць аб такіх рэчах жартлівыя ўвагі,—сорам! (**Голас** на правіцы: гэта паклёпы!). Не, гэта не паклёпы! Калі пан зьезьдзіш у Краснае, Вялейскага павету... (**Галасы** на правіцы: Дайце прозьвішчы!—Розныя выкрыкі на лявіцы. — **Голас** на лявіцы: Міністар адказны за гэтыя забойствы! Другі Мурашка!) — Так, панове, запраўды трэба сказаць, што міністры маўчаць і міністры радзяць толькі тады, як некага забілі і ўкрыць **гэтага нельга,**—вось тады яны выступаюць! Якая гэта бяскарнасьць, да чаго гэта даходзе! Бо гэта (паказуе на лавы міністраў)—ня ўрад; **урад — гэта Мурашка,** і Мурашка гаспадаруе. Улада — гэта сотні тысяч шпігоў. У кожнай вёсцы сядзіць некалькі шпігоў, і дэфэнзыва ўсім кіруе, дэфэнзыва судзіць, дэфэнзыва гаспадаруе. Вы-ж кажаце, што яна—ня мыляецца (воплескі). Калі Мурашка забіў Вечоркевіча і Багіньскага, дык для нас зусім гэта ня было нечым неспадзяваным. Мы ведалі Мурашку! Мурашка—гэта іменна адзін з гэных катаў, які ў працягу гадоў забіваў людзей, аб якім ведаў урад, ведала паліцыя, бо яго—з прычыны такіх надужыцьцяў—пераводзілі з мейсца на мейсца, але, назначаючы на вышэйшыя становішчы. За ўсе гэтыя забойствы, як і за забойства Вечоркевіча і Багіньскага, бясспрэчна адказным зьяўляецца ўрад. І адказнымі зьяўляецеся перадусімі вы, панове, што з цынічнай усьмешкай на вуснах асьмеліліся рабіць увагі аб гэтых страшэнных рэчах (Розныя выкрыкі).

Гэтак дзеецца ў галіне бясьпечнасьці, дзе **органы бясьпечнасьці сталіся найвялікшай небясьпекай,** і чалавек за цэлую мілю стараецца абмінуць паліцыянта, афіцэра, каб не наразіцца на прыкрасьць, а мо' на калецтва, ці нават на сьмерць. Вы, панове, на ўсё гэта лёгка глядзіцё затым, што гэта—у вашых мэтах. У вашых мэтах — па палітычнай лініі Грабскіх, а асабліва Станіслава Грабскага!—ідзе, каб працоўнага народу не дапусьціць узяць уладу ў свае рукі, каб тэрорам прымусіць да дэнацыяналізацыі нацыянальныя меншасьці, а перад усім беларусаў і украінцаў, — і ўсё робіцца ў гэтым кірунку.

Калі можна было ўвясьці ў жыцьцё законы аб школах, калі была выдана выканаўчая інструкцыя да іх,—дык беларускія і ўкраінскія сяляне пачалі масамі падаваць гэныя дэкляарацыі. Тады не абыйшлося бяз ведама ўраду тое, што старосты давалі загады войтам, каб войты ня сьведчылі гэных дэклярацыяў,—і ня толькі ня сьведчылі, але каб усемі спосабамі тэрарызавалі насяленьне. І вось мы бачылі, што войты—супраць выразнае вымогі ўставаў—гэтых дэклярацыяў сьведчыць не хацелі, і супраць выразнага зьместу закона школьныя інспэктары тэрарызавалі народ і адмаўляліся прымаць дэклярацыі. (**Голас** на правіцы: Скажэце, каторы інспэктар, дзе?). Чытай пан інтэрпэляцыі і прапазіцыі, дык будзеш ведаць!—Вось-жа зроблена было ўсё, каб не правясьці ў жыцьцё найменшых палягчэньняў. Дык нічога дзіўнага, што сяньня **астаецца толькі адно: вінаваціць усіх у камунізьме.** Гэта—мэтад дзеля заграніцы. Нам ведама, што загранічным высокім госьцям даюцца гэткія інфармацыі, што, каб не бальшавікі, дык ніякіх беларусаў, ніякіх украінцаў ня было-бы, — што ніякага нацыянальнага руху няма, няма ніякае крыўды, ніякіх надужыцьцяў, — усё хораша, усё гладка, толькі гэтыя няшчасныя камуністы! З гэтых арыштаў, якія рабіліся дзеля стэрарызаваньня насяленьня, што дамагалася роднае школы, — з гэтых арыштаў зрабілі „камуністычную афэру“: меліся быць нейкія замахі, нейкія дывэрсіі, — бог ведае што! Я перакананы, што будуць і суды — і суды будуць засуджаць; але мы ня маем да судоў ня толькі ніякага даверыя, але і ніякае пашаны. Бо суды вераць больш дэфэнзыўным правакатарам, якія, калі абарона пытаецца, на што яны пазываюцца, гавораць аб нейкай дзяржаўнай тайне, заяўляючы, што аб крыніцах сваіх інфармацыяў ня могуць гаварыць, бо дзяржаўныя тайны на гэта не пазваляюць, — вось, суды вераць больш дэфэнзыве, чым беззаганным грамадзянам. Да такіх судоў, да судоў, дзе... (Пас. **Паўло Васыньчук:** Да судоў захватчыкаў даверыя быць ня можа!).

Віцэ-маршалак **Морачэвскі:** Яшчэ раз прызываю п. Васыньчука да парадку.

Пас. **Тарашкевіч:** да такіх судоў, дзе ўсе абаперта на правакацыі,—паўтараю йшчэ раз, — ня толькі даверыя, але і найменшае пашаны мець ня можам. Але суды гэтыя будуць адбывацца, і йшчэ вельмі многа людзей будзе засуджана, калі не на кару сьмерці, дык на доўгія гады вастрогу...

Вы вінаваціце нас у камунізьме, у разьвіваньні „дывэрсыйнага“, як кажаце, а запраўды паўстанчага руху,—вінаваціце ў тым, што мы ня хочам ляяльна стануць на грунце польскае дзяржаўнасьці. Але прыпомніце сабе, што мы прыйшлі ў гэты Сойм іменна затым, каб стануць **на грунце закона.** Мы на мамэнт былі гэткімі наіўнымі, што паверылі ў канстытуцыйныя ілюзіі; мы думалі, што трактаты і канстытуцыі запраўды гарантуюць правы, мінімум грамадзянскіх правоў,—што гарантуюць хоць-бы мінімум палітычных і нацыянальных правоў. Мы прыйшлі ў гэты Сойм, каб змагацца за аўтаномію. (**Голас:** А паступаньне Луцкевіча і іншых?). Пан прыпамінаеш тутака Луцкевіча. Але гэтае паступаньне было ўжо пасьля забойства Нарутовіча панскімі прыяцелямі! — Вось-жа мы выбіралі прэзыдэнта, мы галасавалі за ўрад Сікорскага, каб паказаць гэтую сваю ляяльнасьць. І што-ж сталася? За тое, што мы асьмеліліся выбраць прэзыдэнта,—вы забілі яго. А вы, паны, пайшлі супольна з імі, здрадзіўшы найвыразьней інтарэсы народу, здрадзіўшы тыя лёзунгі, з якімі йшлі на выбары.

Вось-жа мы хацелі йсьці гэтай дарогай, мы мелі гэткія ілюзіі,—але, прыглядзіўшыся да таго, што тутака дзеецца ў гэтай Палацы, што дзеецца ў-ва ўсім краю, аканчальна разьбіліся ня толькі ілюзіі ў масах нашых, але і ў нас. Цяцер мы павінны сказаць, што **было блага, блага ёсьць з палітычнага пагляду, ды будзе ўсё горай,** і тутака ня мейсца гаварыць аб аўтаноміі, — а той, хто стаўляе такія рэчы, як аўтаномія, — той, як палітык, годны жалю, бо ніякае аўтаноміі, ніякага самаўрадаваньня, нават культурнае аўтаноміі няма ў тых палітычных варунках, калі кіруе і гаспадаруе пан і фабрыкант. І наш народ гэта знамяніта разумее, што **ніякае пісанае права, хоць-бы было найлепшае, не паможа,** што Мурашка будзе гаспадараваць і надалей. А правіца ды за ёй і лявіца, якая йдзе на аброці, папіхае дзяржаўны воз у кірунку найчарнейшае рэакцыі. **Замах на канстытуцыю разьвіваецца. Самаўрадаў мы й сёньня ня маем,** у нас гаспадаруе сам староста—гэта й ёсьць „самаўрад, бо што хоча, тое і робе. А гэную самаўрадавую бюракратыю, што праядае апошнія мужыцкія грошы, селянін мусіць утрымліваць на сваім карку бяз ніякае карысьці для сябе. А **ўрадоўцы зьядаюць у нас 90% усіх падаткаў!** Самаўраду няма і ня будзе, бо пройдзе плюральны закон*) (**Голас** на лявіцы: Ня пройдзе!). — Панове з лявіцы, вы перад кожным галасаваньнем вельмі пэўныя сябе, вы пагражаеце, што павядзеце народ за сабой на вуліцу,—але мы перакананы, што нічога ў гэтым кірунку ня зробіце, ды вялікшага гвалту нават падняць не адважыцеся! Вы, што падтрымліваеце ўрад п. Грабскага,—урад, які выразна йдзе з буржуазіяй і за кулісамі найвыразьней змаўляецца з ёй, — вы гэтага зрабіць ня можаце, вы—бяссільныя, вы толькі баламуціце гэтыя мужыцкія і народныя масы, што йдуць за вамі, баламуціце ў тым значэньні, што быццам ад гэтага Сойму, ад гэтага парляманту, дзе выразна пануе пан, абшарнік, буржуазія,— быццам ад яго можна нешта вытаргаваць. Тымчасам выпадкі разьвіваюцца ў тым кірунку, што іменна гэтая правіца—яна ўсюды будуе сабе акопы і абсаджвае сваімі людзьмі. Хутка ня будзе ваяводаў і старостаў, ня будзе войта ў гміне, які ня быў бы, калі ня выразным эндэкам, дык у найлепшым выпадку пястоўцам, а ведама, што „wart pałac Paca, a Pac pałaca“. І мы сяньня павінны, разьбіваючы гэтыя згодніцкія ілюзіі, сказаць нашаму народу, што там, дзе пануе буржуазія, дзе гаспадарує абшарніцтва (—а яно гаспадаруе папраўдзе ўсім краем),—там **ня можа быць вызваленьня.** Нехай наш селянін зразумее, што толькі поўная зьмена ўраду,—ня ўраду тут, на гэтай лаве, але ўладаў у-ва ўсім краю,—што толькі гэткая зьмена можа даць яму вызваленьне. І іменна такая зьмена, каб **усё ўрадаваньне было сялянска-работніцкае,** і каб **гэткі ўрад узяў усю ўладу ў свае рукі.** Забаўляць нашыя масы парляманцкімі абяцанкамі, абяцанкамі тут спэцыяльна польска-соймавымі — мы ня зьбіраемся. Ясна, што **беларускі селянін, беларускія працоўныя масы ў гэтай барацьбе аб свой урад павінны падаць руку сялянам украінскім, сялянам польскім і ўсяму працоўнаму люду** (воплескі на лавах меншасьцяў). Бо толькі **супольным фронтам** — мужык ля мужыка, мужык побач з работнікам на роўных правох—**мы можам адваяваць сабе вызваленьне сацыяльнае, вызваленьне нацыянальнае, вызваленьне палітычнае і нацыянальнае адраджэньне.** Бяз гэтага ніякія ўгоды, ніякія гутаркі нічога не дадуць.

Палажэньне сяньня **не дасьпела** да таго, каб селянін адкапаў з зямлі свае заржавеўшыя стрэльбы, хапіў цапы і пайшоў разьбіваць і біць сваіх ворагаў. Мы лічым, што гэта **сяньня** было-бы **шаленствам.** Наадварот, мы хацелі-бы з гэтае трыбуны **перасьцерагчы масы перад усялякімі неаблічальнымі выступленьнямі,** — тымі выступленьнямі, якія ўрад з вялікай ахвотай хацеў-бы **справацыраваць,** каб утапіць і задушыць у моры крыві. Наша задача—паказаць масам, дзе іх вораг, ад каго і чаго могуць спадзявацца.

Вялікі польскі паэт, чулы патрыот Адам Міцкевіч, маліўся некалі аб **вайну народаў.** „Wojnę narodów daj nam Panie!“ — казаў ён. Ніхто з нас, здаецца, ня будзе маліцца аб вайну народаў, бо кожын з нас, уся сялянская маса, увесь люд працоўны **ня хоча вайны,** ненавідзіць яе, — вайна наагул для яго найстрашнейшая рэч. Але з другога боку мы ня можам ашукваць гэтыя масы міравымі гутаркамі, бо бачым, што **буржуазія ўсяго сьвету падгатаўляецца да вайны,** бо праклятцем яе зьяўляецца тое (—бяз ненавісьці да гэтае буржуазіі кажу так, ужываючы гэтага толькі, як пэўнае гістарычна-сацыяльнае катэгорыі), што гэтая буржуазія адыграла сваю роль, што яна ня можа даць сабе рады з эканамічным крызісам, які агарнуў увесь сьвет. Нацыяналістычна настроеная буржуазія, канкуруючы між сабой, ня здолее стварыць такую арганізацыю прадукцыі, якая давяла-бы гаспадарчую вытворчасьць да аднаасьці і на даўжэйшы час выключыла-бы канкурэнцыю, ды якая ўрэшце дала-бы магчымасьць праз гэта ўхіліць вайну. Мы бачым, што буржуазны сьвет з праклятай фатальнасьцяй імкнецца да новае разьні, да новае вайны.

Дык што-ж? Да чаго нам прыгатаўляць нашыя масы? Ці мы тутака, на ўзор розных лявіцовых адвакатаў і мілітарыстычных інспэктароў, маем клікаць нашыя масы да так-званае. абароны айчызны,—асабліва калі нашая айчызна падзерта?! Не! Мы павінны навучыць нашы масы, што імпэрыялістычная вайна, ведзеная за падзел дабычы, гэта не вайна за іх інтарэсы, а вайна буржуазіі, якая вядзе імпэрыялістычную вайну дзеля падзелу дабычы, дзеля заваяваньня калёніяў, дзеля захвату новых абшараў пад экспансію. Увесь працоўны народ мусіць сказаць сабе тое, што кажа буржуазія: si vis pacem, para bellum*), — хаця ў другім значэньні. Буржуазія кажа, што, калі хочаш мець мір, дык падгатуй вайну. Пралетарыят, сялянскія масы павінны гэтак сама адказаць: **хочам сталага сацыяльнага міру, дык рыхтуйма вайну з буржуазіяй усіх краёў!** (воплескі на лявіцы).

Вось гэта—**міравая гутарка.** Калі-б буржуазія зразумела, што працоўныя масы так ужо сьвядомыя, што ня пойдуць на бойню, на якую іх вядуць быццам у імя айчызны,—дык гэтая буржуазія струхлела-бы і зусім уступіла-бы мейсца другім.

Мы разумеем, што, так ці інакш, ці то з прычыны самога аб'яўленьня вайны, ці ад вынікаў гэтае вайны **мусіць наступіць сацыяльная рэвалюцыя,** і толькі гэтая рэвалюцыя **можа даць нам палітычныя правы, прынесьці нам нацыянальнае адраджэньне і вызваленьне.**

Дык у імя гэтага высокага ідэалу будучыны, у імя сацыялізму мы павінны йсьці да гэтых масаў і ўсьведамляць іх. **Перамога над буржуазіяй дасьць сацыяльны мір.**

Ясна, што ўрадам ня толькі ўжо капіталістычна-абшарніцкім, але ўрадам рэакцыйна-клерыкальным ніякага падтрыманьня даць ня можам і будзем галасаваць проці бюджэту.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усё яшчэ сярод нашых падпішчыкаў—многа неакуратных даўжнікоў!

Памятайце, што газэта—гэта вашая агульная ўласнасьць, якая істнуе за скіладаную вамі падпіску! Дык кожын, хто адчувае патрэбу чытаць родную сваю газэту, хай памятае і свой абавязак перад ёй!

Прысылайце акуратна падпіску! Намаўляйце да гэтага суседзяў і знаёмых!

Каму не пад сілу падпісацца на газэту аднаму,—падпісвайцеся ўскладчыну!

---

*) Паводле новага праекту закона аб самаурадах, некаторым групам насяленьня дасцца больш галасоў, чым звычайным грамадзянам. *Рэд.*

*) Калі хочаш міра, падгатаўляй вайну.

Дзяржауны бюджэт у Сойме.

Фінансава-гаспадарчы стан Польшчы і способы выхаду з крызісу.

У Сойме пачалася дыскусія аб бюджэце.

Дакладчык пас. Зьдзеховскі даў ужо ведамы нам з яго дакладу ў камісіі агляд фінансава-эканамічнага стану Польшчы ў 1924 г.

Коратка напомнім дзеля параўнаньня з 1925 г. аснаўныя факты, пададзеныя дакладчыкам.

У 1924 г. прадбачана было выдаткаў на 1.592 мільёны злотых, а даходаў — 1.453 мільёны злотых. У запраўднасьці, як і трэба было спадзявацца, выдаткаў было больш—бо 1.627 мільёнаў, а даходаў менш 1.422. Бюджэтны дэфіцыт (недахват), прадбачаны ў суме 207 мільёнаў, на дзеле трохі зьменшыўся — да да сумы 173 міл.

Бюджэт на 1925 г., прайшоўшы праз камісію, прадбачыць **выдаткаў два мільярды сто семдзесят шэсьць мільёнаў (2.176.000.000) злотых**, а даходаў— **2.155 мільёнаў**. Гэткім чынам дэфіцыт прадбачыцца вельмі нязначны: толькі 21 мільён злотых,—і бюджэт можа **лічыцца** зраўнаважаным.

„Калі сёлета мы апануем гаспадарчы крызіс, ды яшчэ калі будзе добры ўраджай, дык тады даніны і манаполіі дадуць яшчэ лішак“,—захапляўся дакладчык пекным абразом будучыны.

Але... **„разьвіцьцё прадукцыі“**,—дадаў ён, „ёсьць аднак-жа **варункам** гэтай раўнавагі бюджэту“. Гэта значыць, што ўвесь гэты **лічбавы** абраз фінансавай будучыны будзе залежаць на дзеле ад таго, які будзе **гаспадарчы стан Краю.**

Які-ж быў ён у 1924 годзе? Бо-ж ад таго, што было летась, ён так хутка адыйсьці ўперад ня мог. Гаспадарчы стан, гэта—ня тое, што фінансы: у ім ня можна штучна зрабіць ніяхіх „штук“, якія можна часам зрабіць на кароткі час (коштам гаспадарчае руіны краю!) у галіне фінансаў.

Вось, як дакладчык рысуе гаспадарчы стан Польшчы за 1924 г.

Гаспадарчы стан Польшчы характэрызуецца ўсьцяж разьвіваючымся крызісам, унасьледаваным ад папярэдніх гадоў інфляцыі (папяровай паводкай „марак“). Крызіс залежыць не ад увядзеньня злотага замест маркі, але, наадварот, гэты здаровы злоты забівае цяпер нездаровыя, паўстаўшыя за часоў інфляцыі, гаспадарчыя арганізмы. „Тыя з іх, якія няздольны вынясьці канкурэнцыю і датарнавацца да новых варункаў, ня маюць рацыі істнаваньня і павінны згінуць“,—казаў сам дакладчык.

На жаль, дакладчык не сказаў, сколькі ў Польшчы такіх арганізмаў, якія павінны згінуць, і — ці многа такіх, што датарнуюцца да новых варункаў канкурэнцыі на сусьветным рынку. Сам дакладчык сцьвярджае, што дагэтуль мытамі і чыгункавымі тарыфамі (аплатамі за праезд і правоз тавараў), якімі нармальна дзяржаўная ўлада павінна падтрымліваць прадукцыю ў краю, польскі ўрад карыстаўся **толькі дзеля фінансавых мэтаў** — дзеля штучнага зраўнававаньня бюджэту—коштам якраз аплатных сілаў насяленьня, без якіх **ня можа разьвіцца прадукцыя**. Дзеля добрага бюджэту п. Грабскі руйнаваў унутраны рынак, руйнаваў Край, — руйнаваў падставы, магчымасьць і сэнс прадукцыі — гаспадарчага разьвіцьця краю. Дзіва-ж, што „аднэй з найвялікшых балячак Польшчы ёсьць скупы і дарагі крэдыт“. Ня можа быць патрэбнага на гаспадарчае разьвіцьцё краю лёгкага і таннага крэдыту там, дзе ўсе кішані ў насяленьня спустошаны падаткавым экзэкутарам — дзеля раўнавагі непасільнага для краю бюджэту!..Уся вартасьць грошаў, выпушчаных Банкам у абарот, у Польшчы—**найменшая ў Эўропе:** у Польшчы на кожнага жыхара прыпадае па 20 злотых, пад той час, як у Чэхаславакіі—96, у Францыі—аж 290!.. Але на гэтым найменшым абегу польскі скарб зарабляе (падаткамі і іншымі шляхамі) найбольшы працэнт у Эўропе: у Чэхаславакіі—15%, у Францыі і Галяндыі — 6%, у Швайцарыі—толькі 2%, нават у Румыніі — 10%, а ў Польшчы—аж 36%—кожны месяц.—А гэта значыць, што гаспадарства каштуе насяленьню Польшчы даражэй, як усюды ў Эўропе!.. І гэта значыць, з другога боку, што ўва ўсей Эўропе няма краю з горшымі фінансавымі варункамі для гаспадарчага разьвіцьця, як Польшча!.. Дык ясна, якія шансы мае яна для... канкурэнцыі з іншымі краямі.

„Дзеля прадукцыі не хапіла крэдыту, магчымасьці вывазу (канкурэнцыі!), унутранай пакупной сілы і гаспадарчай (а ня выключна фінансавай!) палітыкі ўраду, ішчэ больш вучона кажа дакладчык. Дык гэта-ж і значыць, што папросту не хапіла ўсіх галоўных фінансава-эканамічных варункаў дзеля разьвіцьця!..

Як той самы ўрад створыць іх з нічога ў гэтым 1925 годзе,—гэтага сакрэту дакладчык не адкрыў.

Для гаспадарчага разьвіцьця ў Польшчы істнуюць толькі **„натуральныя багацьці краю“** і багацьце **работніцкай сілы.** Але бяз першых варункаў разьвіцьця прадукцыі — і тое і другое багацьце ляжыць **бяз ужытку.** Адабраная ў Нямеччыны, багатая вугальлём і мэталамі Сілезія (Сьлёнск) „адпачывае“, а на рынку працы пануе безрабоцьце. 185.000 безработных у Польшчы!..

Дык дзіва, што за грошы, якія асталіся ў кішанёх насяленьня пасьля „вобыску“ падаткавых урадоўцаў, прыходзіцца ня толькі не пашыраць шмат даражэйшую краёвую прадукцыю, але купляць гатовы таньнейшы заграпічны тавар...

Дзіва-ж, што гандлёвы балянс (розьніца між сумай прывозу і вывазу тавараў) даў у 1924 г. забойчы для краю недахват у суме 212 мільёнаў, а за адзін толькі студзень 1925 г. — ужо аж 65 мільёнаў. Калі так пойдзе праз увесь 1925 год, дык за гэты год будзе 500 мільёнаў гаспадарчага дэфіцыту! І гэта — пры зраўнаважаным бюджэце, якім гэтак хваліцца дакладчык.

Дык ясна-ж, што ніколі пры такім гаспадарчым дэфіцыце ня можа на дзеле быць бюджэтнае раўнавагі без дэфіцытнага бюджэту — у такім згалеўшым краю, як Польшча!.. Бо інакш за гэткі фінансавы фукс у 1925 г. край заплаціў-бы аканчальным крахам у 1926 годзе!..

Дакладчык сьцвердзіў, што торговы балянс Польшчы псуецца ня толькі лічбова, але і па якасьці. Гэта значыць, што Польшча ўсё больш вывозіць сыр'я... А гэта-ж якраз і значыць, што ў Польшчы **прадукцыя ўсё падае!..**

Пры гэткіх варунках казаць, як дакладчык, што трэба шукаць рынкаў збыту, не залежных ад Нямеччыны,—даволі плятанічная задача. Пры гэткіх варунках амаль ня ўсе способы выхаду з крызісу, якія суліць дакладчык, прадстаўляюць адно блуднае кола.

Мілей за ўсё для яго „падняцьце выдатнасьці працы“, — гэта значыць: **павялічэньне часу працы ў дзень і адначасна зьменшэньне платы работніка.** Але ці-ж ня сорам гаварыць аб гэтым „варунку“, калі выкінута за борт прадукцыі—на вуліцу—амаль ня 200-тысячная армія работнікаў...

Аб'яднаньне беларускіх і украінскіх камуністаў.

„Słowo“ даведываецца „з мерадайнае крыніцы“, што цэнтральныя камітэты камуністычных партыяў **Заходняе Беларусі і Заходняе Украіны** аб'ядналіся дзеля супольнае барацьбы з польскім урадам. Супольны цэнтр будзе ў Львове або ў Вільні.

Прадстаўнікі гэтага супольнага беларускаўкраінскага цэнтру прымуць учасьце ў **другой беларускай канфэрэнцыі ў Празе Чэскай** у першых днях чэрвеня, на якую з Вільні едуць два дэлегаты.

Ня будучы ў курсе партыйных спраў камуністаў, падаем гэту вестку на адказнасьць „Słowa“.

Важнейшыя здарэньні.

У Польшчы.

Спыненьне забастоўкі батракоў.

Газэты наказуюць, што галоўны ўрад Саюзу Батракоў выдаў адозву з прызывам прыпыніць забастоўку, пратрываўшую цэлы месяц.

Забастоўка, аднак, ня лічыцца скончанай, а толькі адкладаецца да больш выгаднага дзеля барацьбы часу: да пачатку жніва.

Развал „Вызволеня“.

Дэпутаты Косьцялковскі, Хоміньскі, Бартэль, Вараньскі і Сьмяровскі аканчальна разьвіталіся з сваей партыяй „Вызволене“. У пададзенай прэзыдыуму заяве вызваленцы-абшарнікі выстаўляюць за прычыну выхаду тое, што ў праграму партыі ўведзена дамаганьне адабраньня дворных зямель бяз выкупу, і так-жа дамаганьне аддзяленьня касьцёлу ад дзяржавы.

Скандальная адстаўка мін. „roform rolnych“ п. Копчыньскага.

Запраўды-ж мае рацыю „Robotnik“, называючы адстаўку мін. „зямельных рэформ“ п. Копчыньскага скандальнай. На паседжаньні соймавай камісіі, у часе дзяліцьбы асыгнаваных урадам асадніцкіх „крэдытаў“ (без аддачы!) нават сам „міністар асадніцтва“ п. Копчыньскі—з лічбамі і фактамі ў руках—прызнаў добра ведамы з прагавіта-жываедзкіх выступленьняў валынскі „Саюз цывільных асаднікаў“—фікцыйнай і ашуканскай партыйнай арганізацыяй і рашуча адмовіўся даваць праз яго крэдыты на асадніцтва. Гэтую адмову ўлажыў у адпаведную прапазіцыю пэпэсавец Квапіньскі.

Пануючыя ў зямельнай камісіі пястоўцы рашуча абаранілі сваю партыйную арганізацыю і правалілі прапазіцыю Квапіньскага, ня гледзячы на ўсе бяcспрэчныя фактычныя довады міністра.

Тады міністар заявіў, што ён ня можа працаваць з фікцыйнай партыйна-ашуканскай арганізацыяй, якую падтрымлівае проці яго камісія, і падаецца ў адстоўку.

П. Грабскі прыняў адстаўку міністра і назначыў міністрам на яго мейсца... пястоўца Радвана.

Ратуюць Мурашку.

„Dz. Wil.“ даносіць:

„Акт абвінавачаньня ў справе Мурашкі будзе скончаны ў другой палове траўня. Але ня трэба спадзявацца хуткага назначэньня разгляду справы ў Судзе. Як мы (газэта) даведаліся, абарона пастанавіла дамагацца экспэртызы для сьцьвярджэньня псыхічнага стану Мурашкі (—ці не вар'ят?!).

Ведама-ж — калі катаваць народ на „Крэсах“, дык здароў, а калі папаўся пад суд за яўнае за забойства, дык... „хворы ўмыслова“.

Арышт камсамольцаў у Лодзі.

У Лодзі арыштавана ячэйка камуністычнай моладзі лікам у 18 асоб.

Заграніцай.

Літоўская дэманстрацыя на польскай граніцы.

З Коўны паведамляюць, што міністэрства абароны пастанавіла зрабіць улетку артылерыйскую вучэбную стральбу — у былых расейскіх лагерах каля ст. Араны.

Пэўна-ж і польская ваенная ўлада адкажа так ці інакш на гэтыя знакі ўвагі.

Сплаў па Нёмне.

Ліга Народаў даручыла свайму прадстаўніку ў Клайпэдзкім порце безадкладна заняцца справай сплаву па Нёмне.

„Мабілізацыя пратэсту“.

У знак пратэсту проці пастановы Антанты аб павялічаньні баўгарскай арміі Грэцыя зрабіла частковую мабілізацыю сваей арміі і разам з Югаславіяй і Румыніяй падала пратэст у Раду Паслоў.

Крывавыя здарэньні ў Парыжу.

23/IV на мітынгу, скліканым дэпутатам Тэтэнжэ, дайшло да крывавай бойкі паміж сябрамі „Лігі Патрыётаў“ і камуністамі, стрэламі з рэвальвэраў 9 асоб ранены, з іх 4 памёрлі. Як пішуць газэты, яны забіты камуністамі.

Заява Брыяна.

У адказ на заяву нацыяналіста Фабрі, Брыян заявіў, што ў сваей нямецкай палітыцы ён будзе апірацца на арт. 44 (значыць і 42 і 43 *Рэд.*) Вэрсальскага Трактату, які найменшае нарушэньне Нямеччынай пастановы аб разбраеньні правага берагу Рэйну лічыць ужо пачаткам вайны з яе боку. Тады Францыя, не чакаючы далейшых падзей, зараз-жа дасьць загад сваей арміі ісьці на Бэрлін.

Пры такіх настроях—дзе ўжо тут клапаціцца аб нейкай „санацыі франка“.

Дзіва, што Кайо ў сваей прамове ў парляманце адкрыта заявіў (за што яго лаюць усе францускія газэты), што ён — не гаспадар палажэньня нават у фінансах, на стан якіх уплываюць рэчы, зусім ад яго незалежныя.

Добра зразумелі гэта ў Амэрыцы.

Змова ў Гішпаніі.

З Мадрыту паведамляюць, што паліцыя напала на сьлед змовы проці прэм'ера ген. дэ-Рывэра.

Зьмены ў англійскім урадзе.

Прэм'ер Балдвін запрапанаваў лёрду Бальфуру ўвайсьці ў габінэт на мейсца лёрда Солсбэры, які назначаны на мейсца п. Керзона — старшынёй Тайнай Рады.

Англічане бамбардуюць Мэсапатамію.

З Багдаду паведамляюць, што англійскія лятучыя эскадры бамбардуюць мясцовасьці навакол Мосулю, ахопленыя паўстаньнем курдаў. Англійцы страцілі 3 лётчыкаў і 4 аэрапляны.

Знайшлі вінаватых!

З Вены паведамляюць, што ў Баўгарыі арыштаваны ўсе расейскія эмігранты — у сувязі з замахам..

Як ведама, расейская эміграцыя складаецца якраз з найбольшых ворагаў камуністаў!..

Канец Партугальскай „Рэвалюцыі“.

Усе рабіўшыя „рэвалюцыю“ афіцэры арыштаваны ўрадам. Усяго забітых 13, раненых 73. Усе вайсковыя часьці, прымаўшыя ўчасьце ў паўстаньні,—у лічбе 1.200 урад пастанавіў распусьціць.

Работнікі зрабілі дэманстрацыю пратэсту.

Выкрытая змова ў Токіо.

У Токіо выкрыта змова, якая мела мэтай забойства прэм'ера Като. Зроблена шмат арыштаў.

ХРОНІКА.

„Утраквістычныя курсы“. „Słowo“ даведалася, што віленскае куратарыум маніцца ўлетку утраквістычныя (двуязычныя) дапаўняючыя курсы „для вучыцялёў-**палякоў**, якія гавораць пабеларуску і хочуць запоўніць сваю эдукацыю ў гэтай мове, каб атрымаць адпаведныя становішчы ў **беларускіх** школах“.

Вось, як улада разьвязывае пытаньне аб вучыцялёх для беларускіх школ: яны будуць абсаджаны **палякамі**, якія ў працягу **двух месяцаў** маюць навучыцца беларускае мовы!

Вось, да чаго давяла банда беларускіх здраднікаў, што вядзе барацьбу з дамаганьнем народу беларускае школы! Гэта-ж—вынік „працы“ Павлюкевічаў, Валэйшаў, Косьцевічаў і ўсяе гэная нягоднае хаўрузіі, што лгала беларускаму народу аб беларускіх курсах „ужо 10 сакавіка“ і праз „Грам. Голас“ трэбавала прысылкі ім нават дакумэнтаў ад кандыдатаў на курсы...

Пэўне-ж, Косьцевіч у аддзяку за ўсе гэтыя подласьці будзе запрошаны да ўчасьця ў „фабрыкаваньні“ з палякоў—„беларускіх“ настаўнікаў!

Вось, дзеля чаго былі створаны і „Часовая Беларуская Рада“, і косьцевічаўская „Прасьвета“!

Да маёвага сьвята. Цэнтральны ўрад пэпээсаў пастанавіў у дзень 1 траўня (мая) ніякіх паходаў на вуліцах не рабіць, а—зачыніцца на мітынгі ў розных салях і—сьвяткаваць сабе „пралетарскую салідарнасьць“ асобна ад усіх іншых—трохі „чырванейшых“ работнікаў.

Гэтак і ў Вільні памогуць паны польскія сацыялісты, каму належыць, лавіць на вуліцах 1 мая „камуністаў“: бо ці-ж ня ясна, што ўсе, хто выйдзе ў традыцыйным на ўвесь сьвет паходзе на вуліцу ў гэты дзень, — будуць „камуністы“... А зусім ляяльныя да сучаснага сацыяльнага і іншага ладу паны пэпээсы — будуць ціха сабе сядзець, замкнуўшыся ў мястовай салі і—славіць адзін аднаго за „паньствовую творчасьць“.

Здаецца, дагэтуль нават адміністрацыя не забараняла паходаў, а пэпээсы ўжо наперад забаранілі сабе самі...—І бясьпечней і... карысьней для „паньствовай творчасьці“.

Першамайскія адозвы, як пішуць віленскія газэты, былі параскіданы ў Вільні ў апошнія дні камуністамі. Раскідаліся нумары беларускага „Чырвонага Сьцягу“, беларускія камуністычныя брашуры, ды адозвы ў беларускай, польскай, жыдоўскай і расейскай мовах.

Арыштаваны адзін з раскідаўшых адозвы.

Арышты „камуністычных ячэек“. „Dz Wil.“ піша, што паліцыя аканчальна зьліквідавала камуністычную ячэйку ў Сьвянцяншчыне, якая працавала на абшары этнаграфічна літоўскіх гмінаў Мэлегі (ці не Маляты?), Даўгелі і Відзы, маючы галоўную сядзібу ў Нова-Сьвянцянах. На чале арганізацыі стаялі Міхал, Фэлікс і Ядвіга Зайкізы. Арганізатар — бальшавіцкі камісар (?) Свайкоўскі — здалеў уцячы за кардон. Арыштаваны яго памоцнікі: Прычала, Пяткевіч і Карнееў. Пры вобысках знойдзена камуністычная літэратура і інфармацыі II аддзелу (?).

„Słowo“ паказуе, што, „дзякуючы энэргіі органаў палітычнае паліцыі“, выкрыта камуністычная ячэйка ў Тумілавіцкай гміне, Дунілавіцкага павету. Арыштаваны 6 асоб.

Арышты. У Вільні, у Закрэтным лесе, паліцыя заарыштавала Ігната Шурмовіча, нелегальна прыехаўшага з Літвы. Яго падазраваюць у шпіёнстве на карысьць Літвы.

Арыштаваных Абрама Беспраздольнага і Хаіма Вястонскага падазраваюць у шпіёнстве на карысьць С.С.Р.Р.

Тыповы „бандыцкі напад“. У м. Даўгінаве некалькі часу назад 4 азброеныя бандыты напалі на в. Варданішкі. Вайсковы атрад (пагранічнікі) пачаў перастрэлку з бандытамі, з якіх адзін, Лук'яновіч, быў забіты, рэшта ўцякла.

Так гаварыла вайсковая рэляцыя пагранічнікаў, абыйшоўшая ўсе газэты.

Але дазнаньне (паліцэйскае?) высьветліла нешта зусім інакшае.

У запраўднасьці было так. У Варданішках беларуская сялянская моладзь наладзіла вечарынку, на якой мірна весялілася. — Каля 10 г. вечара ў хату ўварваліся польскія пагранічнікі, якія выгналі ўсіх хлапцоў, пакінуўшы сабе толькі дзяўчат... На пратэсты безбаронных сялян пагранічнікі пачалі страляць і забілі Лук'яновіча.—Пасьля гэтага забойства пагранічнікі зрабілі яшчэ і фальшывы данос на „бандытаў“...

Выпадак характэрны для „Крэсаў“, можа, на'т тыповы. Нязвычайнай і новай рысай у ім ёсьць толькі гэтае разыходжаньне між пагранічнікамі і паліцыяй, рабіўшай, як здаецца, гэтае дазнаньне...

Эвангельле пабеларуску. Як мы даведаліся, выдавецкая фірма ў Лодзі „Компас“ пачала друкаваць пераклад на беларускую мову чатырох Эвангельляў — паводле Мацьвея, Марка, Лукі і Іоана.

Пераклад зроблены паводле грэцкага арыгіналу.

Віленскія каталікі ў справе конкордату. Літоўскія газэты паведамляюць, што віленскія каталікі-літвіны і беларусы — паслалі да папскага нунцыя ў Польшчы монсіньёра Ляўры мэмарыял з пратэстам проці ўключэньня Віленшчыны ў польскую касьцельную эпархію.

Выстаўка гісторыі віленскага друкарства. „Таварыства Прыяцеляў Унівэрсытэцкай Бібліятэкі ў Вільні“ арганізуе гістарычную выстаўку віленскага друкарства—у сувязі з 400-лецьцем выхаду першай кніжкі ў Вільні. Мясцовыя польскія газэты, падаўшыя аб гэтым заметкі ў хроніцы, ня кажуць, што гэтая першая кніжка беларуская...

Да ўраду Таварыства, закладзенага, здаецца, адвакатам Врублеўскім, (які Таварыству гэтаму аддаў сваю вялізарную бібліятэку), уваходзяць сам адвакат Врублеўскі, п. Л. Абрамовіч, дырэктар унівэрс. бібліятэкі доктар Рыгель і інш.

Замала п'юць у Віленшчыне! Урад Дэлегата зьвярнуў увагу на тое, што ў некаторых паветах Округу лішне многа (!) „безалькагольных дзён“ — (дзён, калі нельга купляць і піць (!?) гарэлку).

Быццам, у некаторых паветах колькасьць гэткіх „сумных“ дзён даходзіць аж да 250! Дзеля гэтага дэлегацкі ўрад, відаць, жадаючы павялічыць лічбу „вясёлых“ дзён, зьвярнуўся да паноў старостаў з запытаньнем, якая іх „oświecona opinja“ ў гэтай справе...

Матыў Дэлегатуры, як падае „Dz. Wil.“, ведама-ж чыста маральны: усёроўна п'юць ня менш весела і ў сумныя дні, але абыходзячы закон, а гэта-ж псуе маральнасьць... Дык хай лепш ужо п'юць—„на законном основаніи“, як калісьці ў „добрыя старыя часы вінапольскі“...

Яшчэ злодзей-урадовец. „Słowo“ паказуе (не даючы толькі прозьвішча), што аднаго з урадоўцаў віленска-троцкага староства надоўячы арыштавалі за кражу скарбовых грошы.

Апошні тэрмін абмену марак канчаецца 31-га мая с. г. Маркі, не абмененыя да гэтага дня на злотыя, губляюць ужо ўсякую цану.

„Чырвоны певень“.

„Słowo“ падае гэткія інфармацыі:

Колькі дзён назад згарэла афіцына з кватэрамі для адміністрацыі ў двары Верашчакаў Вялікія Мажэйкі.

Цераз два дні спалена часьць гаспадарскіх будынкаў у двары Ваньковіча Рамаоўцы.

Абодва пажары ўзьняліся ад зумыснага падпалу—на палітычным грунце.

Забойства памешчыка Шаркевіча ў Яшунах, адміністратара маёнтку Яшуны, Солечніцкае гміны, Віленскага павету (застрэлены з рэвальвэру праз вакно), паказуе, што замахі не абмяжоўваюцца падпаламі.

Карэспандэнцыі.

Хуліганства.

Часта бываючы ў Вільні, а асабліва ў кірмашовыя дні, здарылася мне бачыць, як па Завальнай вуліцы каля „Галі“ і далей ходзяць розныя ашуканцы—хуліганы, палюючы на лёгкаверных сялян—беларусаў, прапануючы ім купіць розныя рэчы. Найчасьцей гэтыя ашуканцы, каб задабрыць селяніна, паказаць, што і яны нібы беларусы, зварочваюцца да сялян памаскоўску ў гэты спосаб:

— „Вы не знаете, где здесь белорускиий кооператив?“ або:

— „Вы не знаете, где здесь белорускиий беженский комитет?“.

І да гэтага такі хуліган дабаўле, што едзе транспарт палонных з Нямеччыны, або Бэльгіі і маюць з сабой розныя матар'ялы, золата, срэбра, скуры і г. д., але баяцца, што ім гэтыя тавары на граніцы бальшавікі адбяруць, дык прапануюць купіць, што-колечы вельмі сходна. Калі лёгкаверны селянін згаджаецца на гэтую прапазіцыю, тагды яны йдуць дзе-колечы да панадворку, і тут ашуканец дастае з пад палы свой тавар, кажучы не разглядаць, а хаваць, бо пабачыць паліцыя і адбярэць. Калі селянін ня зусім яшчэ згаджаецца, тагды, як з пад зямлі, вырастае нейкі жыд, адбірае ад селяніна той тавар і хутка дае таму ашуканцу грошы. Але ашуканец не бярэ ад жыда грошы, а адбірае ў яго назад свой тавар і дае селяніну, лаючы жыда і кажучы, што ён жыдом не прадае, а лепей за паўцаны аддасьць свайму брату—хрысьціяніну. Селянін і запраўды думае, што знайшоў „свайго брата дабрадзея“, які гэтак сходна прадае свой тавар, а калі жыд больш даваў, то пэўне ж гэты тавар таго, а мо' і больш варты (бо яны, жыды, знаюцца на таварах!), і ахвотна плаціць грошы. І толькі пасьля, па нейкім часе, селянін агледзіцца, што стаўся ахвярай ашуканцаў—хуліганаў, якія замест добрага тавару далі нешта нічога ня вартае, так што грошы ўкінуў, усё роўна як у балота.

Адзін селянін мне апавядаў, як ён гэткім спосабам за 50 злотых купіў „праўдзівы“ залаты гадзіньнік, які праз два тыдні пачарнеў, а яшчэ хутчэй папсуўся; а калі панёс да загармайстра, каб яго паправіць, то апошні адмовіўся, кажучы, што рапараваньне даражэй будзе каштаваць, як сам гадзіньнік, за які ўся цана—2 злоты!..

Другі апавядаў, як за 10 злотых купіў 10 „расейскіх срэбных рублёў“, якія пасьля ў хаце пабіў са злосьці, бо аказаліся шклянымі.

А шавец апавядаў, як купіў у Вільні ў аднэй бабы з пад палы цэлы пак „скуры“ на падошвы, якая ў хаце аказалася містэрна падробленым кардонам. І гэтак далей.

Цікава, колькі сялянскіх, цяжка запрацаваных грошаў папала ў кішані ашуканцаў пры тых ці іншых здарэньнях? І чаму гэта ашуканцы—хуліганы бяскарна гуляюць па найрухліўшай вуліцы Вільні, калі паліцыі ўсіх сартоў маем пад дастаткам? Што паліцыя слаба глядзіць за гэтым, маю права сказаць, бо пішучаму гэтыя словы давялося бачыць гэткі выпадак, які яскрава сьведчыць аб бяздзейнасьці „нашае“ паліцыі. У Вільні а 12 гадз. ўначы, калі пасажыры выходзілі з цягніка, тут жа, каля самага вагзала, партыя хуліганаў стаўпілася і нібы пачалі біцца, а колькі іх таварышаў пачалі нібы разводзіць і гадзіць забіякаў. На гэты від затрымалася шмат цікавых разявякаў, а хуліганы ў той час, калі ўвага цікавых была зьвернена на авантурнікаў, пачалі, як кажуць, „выгружаць кішані“, і гэткім спосабам у аднаго селяніна былі выцегнены з кішані дакумэнты і грошы. Паліцыя ўсё гэтае бачыла і зарэагавала толькі тагды, калі чалавека ўжо абакралі, а ад хуліганаў і сьлед прастыў. Мусіць, у польскай паліцыі ёсьць абавязкова наша беларуская прыказка:

„Свой сячыся, рубайся, а чужы не мяшайся“, або:

„Дзе двух б'юцца,—там трэці ня лезь!“.

Будзьце, сяляне, асьцярожны ў месьці і высьцерагайцеся ўсялякіх ашуканцаў—хуліганаў.

Янка Маланка.

АБВЕСТКА.

У нядзелю 3-га траўня г. г.

—) АДБУДЗЕЦЦА (—

пленарнае паседжаньне

Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады

а 4-ай гадзіне папаўдні ў памешканьні Рады — Віленская 12—6.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Арганізацыйны плян Віленскай Беларускай Гімназіі на 1925—1926 школьны год;
2. Бягучыя справы.

29. IV. **Ц. Б. Ш. Р.**

Вобыскі і арышты.

(З *Слонімшчыны*).

19. IV. 1925 году, а 8 гадзіне ўвечары пяцёра паліцыянтаў на чале з вывядоўцам Завадзкім зрабілі вобыск у жыхара вёскі Касьцецева, Івана Багданчука. Шукалі камуністычнае літэратуры і аружжа, але нічога гэткага не знайшлі. У часе вобыску забралі выкрайку з ганавіц, якая зроблена ў 1918 годзе з расейскае газэты, і два старых шомпалы, якія знайшлі дзеці, пасучы быдла.

Між іншым у Івана Багданчука пыталіся, дзе яго сын Аляксандар? Аляксандар у гэты дзень (на першы дзень Вялікадня) быў у гасьцёх у свайго дзядзькі ў Чамярох. Да прыходу Аляксандра бацька быў заарыштаваны. Увечары сын пайшоў на пастарунак даведацца аб бацьку, але яго арыштавалі, а бацьку (58 гадоў) звольнілі. Арыштаванага направілі ў Слонімскую экспозытуру, дзе прадзяржалі 4 дні і як след ужо пасадзілі ў турму.

20. IV насілі з дому есьці арыштаванаму: яго дзядзька і 15-гадовы брат Сяргей. Абодвых іх арыштавалі, але дзядзьку пусьцілі ўвечары, а брата пратрымалі ажно тры дні, і пасьля дапросаў і пабояў 15-гадовы хлапец прыйшоў да дому з апухшаю галавою.

Арыштаванага Аляксандра Багданчука вінавацяць нібы ў раскіданьні камуністычных адозваў перад усяношчнаю. Але, як чутно ад людзей, адозвамі гэнымі быў заліты ўвесь Слонімскі павет.

Пры вобысках 2. IV ў солтыса вёскі Вераб'евічы знайшлі кінжал, якім ён крышыў сьвіньням зельле. Солтыс Давыдзік быў заарыштаваны, але ўвечары яго звольнілі.

У солтыса вёскі Касьцецева Савацца знайшлі дубальтоўку і вінтоўку. Вінтоўку нібы пакінуў дома яго старэйшы брат, які служыць у паліцыі. Солтыс Савацец заарыштаваны і сядзіць ў вязьнях Слоніма. Аружжа забралі.

Вобыскі і арышты пастуцова робяцца далей.

Беларус.

Юрыдычныя парады.

Каўпацкаму.—Калі ўвесь час сенакосам карысталіся толькі Вы, дык обчаства адабраць ня можа.

Падпішчыку № 379.—Маці можа адабраць 1/7 часьць і гэту часьць можа адпісаць, каму хоча.

Падпішчыку № 217.— Папрабуйце зьвярнуцца да „Izby Skarbowej“.

Маці і дочкі маюць права кожная на 1/7 часьць зямлі і інвэнтара, рэшта йдзець на сына. Зробленая расьпіска ніякае сілы ня маець, трэба рабіць нотарыяльны акт падзелу.

Паштовая скрынка.

Я. А—чу ў Мілейчыцах, Бельскага пав.—Вестка „Русск. Голоса“ няточная. Праўдзіва тое, што пісала „Беларуская Доля“.

Рэдактар-Выдавец **Антон Пракапеня.**

Друкарня **Н. Левін і Сын,** Вільня, Нямецкая 22.